**Сцепанішчава, В.** Выбар зроблен! / В. Сцепанішчава // Віцебскі рабочы. — 1989. — 4 крас. — С. 3.

## ВЫБАР ЗРОБЛЕН!

«Віншуем з выбраннем у народныя дэпутаты СССР Віктара Якушкіна! Спадзяёмся, што ён будзе весці бескампрамісную барацьбу за перабудову, за абнаўленне нашага грамадства. Дзякуй усім выбаршчыкам, якія аддалі галасы за нашага кандыдата. Калектыў СПТВ № 147. Гарадскі савет воінаў-інтэрнацыяналістаў. Група даверaных асоб».

Такая тэлеграма прыйшла ў рэдакцыю.

Наш карэспандэнт сустрэлася з Віктарам Якушкіным і задала яму некалькі пытанняў.

– Віктар, скажыце шчыра: вы былі ўпэўнены ў такім вось пераможным для вас зыходзе? Як думаеце, чаму менавіта на вас сарыентаваліся нашы выбаршчыкі?

– Было прадчуванне... Яно з'явілася ўжо ў час перадвыбарнага акруговага сходу. Людзям хочацца сапраўдных перамен. Хто іх можа забяспечыць? Той, хто па свайму паходжанню, па ўкладу жыцця, па нейкай грамадскай практыцы свабодны ад стэрэатыпаў застою. Якушкін, меркавалі мае прыхільнікі, свабодны.

Майму галоўнаму канкурэнту, думаю, перашкодзілі якраз яго вялікія заслугі, узрост... Як гэта ні парадаксальна гучыць.

– У нейкі момант мне падалося, што вы вельмі рызыкуеце. Маўчалі. Не адчувалася імкненне захапіць словам, падаць сябе ярчэй, выказаць ідэі. Словам, здалося, што вы зусім не выкарыстоўваеце псіхалагічны момант.

– А каму патрэбны сёння прыгожыя словы? У рэшце рэшт гэта праблема выбаршчыкаў – адрозніць сапраўднага выразніка сваіх інтарэсаў. У мяне былі давераныя асобы, як аказалася, актыўныя, яны і спавядалі маю праграму.

– Дзейнічалі яны сапраўды актыўна. У горадзе паявілася столькі плакатаў з вашай праграмай, партрэтамі...

– Лічу, што перамогу ў многім забяспечваюць менавіта давераныя асобы. Мяне вылучылі кандыдатам сем калектываў. Як гэта здарылася? Проста ініцыятыўная група ішла да людзей і прапаноўвала маю кандыдатуру. Рабяты забяспечылі мне выгадную пазіцыю на перадвыбарным сходзе. Дарэчы, калі гаварыць аб той сітуацыі ўвогуле, то яна мне не здаецца правільнай. Атрымліваецца так, што варта толькі абысці ўсе калектывы, добра папрасіць іх, сагітаваць, забяспечыць большае прадстаўніцтва на сходзе – і перамога за табой. Думаю, што выбаршчыкі, перш чым вызначыць кандыдата, павінны мець магчымасць грунтоўна пазнаёміцца з ім. Перадвыбарныя сходы павінны былі б прайсці ў кожным раёне горада.

І яшчэ. Я правёў з выбаршчыкамі каля пяцідзесяці сустрэч. Але, можа, было б лепш, калі б гэтых сустрэч адбылося менш, затое большымі былі б аўдыторыі, пабольш часу для высвятлення пазіцый. Вось Уладзімір Анісімавіч Сітоў лічыць, што яму трэба адпрацаваць з аўдыторыяй паўтары гадзіны, каб яго зразумелі. А мы сустрэч правялі многа, ды сустрэліся з нямногімі.

Увогуле, урокі выбарнай кампаніі трэба сур'ёзна прааналізаваць.

– Большасць прагаласавала за вас. Давер – рэч прыемная? Вы задаволены?

Дэпутат адмоўна ківае галавой.

– Есць людзі – тэарэтыкі па натуры. Я – практык. І зараз не ў сваёй талерцы. Ці змагу апраўдаць давер, які сам па сабе, канечне, прыемны.

Калі б балаціраваўся разам з М. А. Слямнёвым, кандыдатуру сваю зняў бы. Ён лепш за мяне здольны не толькі прадставіць нашы прафесіянальныя і педагагічныя інтарэсы ў вярхоўным органе ўлады, але і выказаць агульныя інтарэсы людзей.

Што мяне вельмі бянтэжыць сёння? Літаральна напаляецца тэлефон ад званкоў. Людзі звяртаюцца з просьбамі, а я пакуль нічым не магу ім дапамагчы... Пытаюся: што далей рабіць? А мне кажуць: чакай.

– Іншымі словамі, вам хацелася б ужо сёння прыступіць да выканання абавязкаў? Але ж гэта не так проста – быць працуючым парламентарыем. Трэба валодаць арганізатарскімі здольнасцямі, палітычнымі, дзелавымі...

– Першая мая задача цяпер – вучыцца. Для пачатку хочацца стаць юрыдычна адукаваным чалавекам. Лепш разабрацца, што адбываецца ў нашым грамадстве. Пакуль ёсць толькі адчуванне кірунку той палітыкі; за якую стаю сам і стаяць мае выбаршчыкі. А трэба ж падрыхтавацца да заканатворчай работы, хацелася б не проста галасаваць за бюджэт, а абмяркоўваць яго... Пакуль не зразумею хоць што-небудзь у гэтай рабоце – не супакоюся. Будзе адчуванне, што займаю чужое месца.

– Кампетэнтнасць можа прыйсці. А вось ці хопіць мужнасці? У нас, як вядома, больш разумных, чым смелых.

– А мне нечага губляць... Я не начальнік, не член нейкага там органа. Хоць заўтра магу паехаць... скажам, на Чукотку.

– А калі з'явіцца сям'я?

– О! Сям'я, думаю, многае ўскладняе ў нашым жыцці.

– А пакуль, значыць, гатовы ісці і «не ў нагу»? Калі спатрэбіцца?

– Спадзяюся, што ў мяне будуць аднадумцы. Але помню і армейскае правіла, што адзін у полі – таксама воін.

...Гутарка закончылася. Віктара чакалі ў ваенна-спартыўным клубе СШ № 40.

**В. Сцепанішчава**